*Таццяна Вабішчэвіч (г. Мінск)*

# ПРАБЛЕМА ПРАФЕСІЯНАЛІЗАЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СЛОЎНАГА МАСТАЦТВА Ў ЛІТАРАТУРНА-КРЫТЫЧНЫХ ПРАЦАХ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

Разглядаючы ў артыкуле «Беларускае адраджэнне» (1914) асаблівасці станаўлення беларускай літаратурна-мастацкай традыцыі Новага часу, Максім Багдановіч зрабіў гісторыка-літаратурную заўвагу, якая акрэслівае праблемнае поле, да сённяшняга дня досыць адрывіста, несістэмна адрэфлексаванае айчынным літаратуразнаўствам: «Гора яе (беларускай літаратуры. – *Т. В.*) заключалася ў тым, – піша Багдановіч-даследчык, – што ў яе не было ані чытачоў, ані пісьменнікаў – былі толькі *аматары беларускага пісьменства* (вылучана намі. – *Т. В.*)» [1, с. 267].

Сацыяльна-гістарычныя ўмовы, у якіх адбывалася ў XIX ст. зараджэнне новай беларускай літаратуры, М. Багдановіч расцэньвае як сітуацыю «бязмэтнасці існавання»: «непісьменны народ гэтых твораў не мог ведаць, для інтэлігенцыі ж яны не былі хлебам духоўным, а толькі простым дадаткам да літаратуры польскай ці велікарускай» [1, с. 267]. «Бязмэтнасць існавання» зрабіла, паводле М. Багдановіча, «глыбокі адбітак на ўсім мінулым (маецца на ўвазе абсяг XIX ст. – *Т. В.*) беларускай літаратуры» і абумовіла мастацкую слабасць і аб'ектыўную абмежаванасць перспектыў тагачаснага беларускамоўнага пісьменства, своеасаблівую яго «парапрафесійнасць». «Падобнае становішча, – адзначае Багдановіч, – працягвалася да самага апошняга часу» [1, с. 267], г. зн. да перыяду, храналагічна адпаведнага перыяду дзейнасці паэта. Такое Багдановічава выказванне дае падставы лічыць, што аўтар артыкула фіксаваў пэўныя праявы вербальна-мастацкай «парапрафесійнасці» і ў беларускім літаратурным руху пачатку XX ст. Іначай кажучы, рэцыдывы «аматарскага» стаўлення да мастацкага слова

ўсё яшчэ працягвалі мець месца ў пару нашаніўства – нягледзячы на тое, што сацыяльна-гістарычная сітуацыя «бязмэтнасці існавання» беларускамоўнай творчасці адышла ў мінулае і што ў першае дзесяцігоддзе XX ст. адбыліся карэнныя змены ў арганізацыйнай структуры, колькасных паказчыках і якаснай дынаміцы ідэйна-эстэтычнага развіцця маладой нацыянальнай літаратуры.

У нашаніўскую пару беларускі літаратурны працэс упершыню за некалькі стагоддзяў атрымаў прыкметы перманентнасці, недыскрэтнасці: сфарміраваліся пісьменніцкі асяродак і масавая чытацкая аўдыторыя, былі створаны інстытуты, неабходныя для стабільнай цыркуляцыі мастацкага слова ў грамадстве (перыядычныя выданні, выдавецтвы). Такім чынам, склаўся той мінімальны набор умоў, якія ёсць абавязковымі для нармальнага функцыянавання нацыянальнай літаратуры ў «прафесійным» вымярэнні – як сапраўды дзейснага чынніка «развіцця… культуры» [1, с. 210].

Разам з тым шэраг фактараў станаўлення сучаснай беларускай літаратурнай традыцыі – у першую чаргу адсутнасць «дасведчанага» ў эстэтычных пытаннях рэцыпіента, неабходнасць арыентацыі на «масавую» аўдыторыю, прыцягненне ў якасці асноўнай літаратуратворчай сілы аўтараў-самавукаў, бясспрэчна таленавітых, але не заўжды дастаткова падрыхтаваных у галіне тэорыі і тэхнікі літаратурна-мастацкай дзейнасці[1], – давалі М. Багдановічу-крытыку і ідэолагу развіцця нацыянальнай літаратуры справядлівую нагоду для ўзмоцненай увагі да пытанняў прафесіяналізацыі беларускага слоўнага мастацтва, вызвалення літаратурнай працы ад «налёту» аматарства (у якіх бы формах апошняе не праяўлялася – ці то ў «бязмэтнасці існавання» літаратуры, адсутнасці чытачоў, «духоўныя патрэбы» якіх яна б «праўдзіва задавальняла» [1, с. 210], ці то ў недасканаласці, неапрацаванасці формы мастацкіх тэкстаў, у другаснасці і неарыгінальнасці змястоўна-тэматычнага боку твораў і інш.).

Пад прафесіяналізацыяй слоўнага мастацтва тут разумеецца акцэнтаванне спецыфічных прыкмет літаратуры як культурнага феномена і адметнага віду чалавечай дзейнасці (з адпаведнымі патрабаваннямі да ведаў і здольнасцей суб'екта гэтай дзейнасці), а таксама дыстанцыяванне

---

[1] Немагчыма не згадаць у гэтым кантэксце Коласавага «Сымона-Музыку», дзе аўтар (грунтуючыся шмат у чым на факты ўласнай біяграфіі) у мастацкай форме артыкулюе праблему «самавуцтва». У знакамітым творы пра лёс «саматужнага музыкі», «песняра з народу» яна асэнсоўваецца як адна з «болевых кропак» станаўлення і развіцця нацыянальнага пісьменства: «Ці можа быць вяліка // Вартасць з […] // Сына торбы і зямлі?» [4, с. 133], – гэткае звышпрынцыповае пытанне ставіць аўтар паэмы. Невыпадкова, што лаканічны адказ на яго ўкладзены Коласам у вусны прафесійнага музыкі: «Гм! Праўдзівы ты мастак!», «Але *тэхнікі* ёсць брак…» [4, с. 133–134], – так ацэньвае Сымонава гранне замкавы капельмайстар пан Галыга.

мастацкага мыслення і маўлення ад мыслення і маўлення штодзённага. Даючы шырокую фармулёўку, можна сказаць, што прафесіяналізацыя – гэта эстэтычнае самаўсведамленне літаратуры і гарантаванне яе перманентнага эстэтычнага самарэфлексавання ў далейшым, у патэнцыйна бясконцым працэсе функцыянавання нацыянальнай мастацкай традыцыі. Прасторай разгортвання прафесіяналізацыі з'яўляюцца літаратурна-крытычны і ўласна мастацкі дыскурсы ў іх цеснай спалучанасці, узаемаабумоўленасці.

Відавочна, праблема прафесіяналізацыі беларускамоўнай літаратурнай творчасці мела хparty храналагічна лакалізаваны характар, была вырашальнай, часовай. З'яўляючыся актуальнай на працягу ўсяго XIX ст., яна перажыла свой пік у 1900–1910-я гады – на лёсавызначальным этапе нацыя- і літаратурагенезу. Па сутнасці, у перыяд нашаніўства неабходнасць прафесіяналізацыі нацыянальнага літаратурнага мастацтва, набыцця ім самасвядомасці выступіла ў якасці адной з істотных умоў афармлення беларускай літаратуры ў цэласную, паўнавартасную, жыццяздольную эстэтычную сістэму, уключаную ў еўрапейскі літаратурна-інтэлектуальны працэс.

Улічваючы, што ў мастацкай практыцы, навукова-тэарэтычнай і крытычнай дзейнасці Максіма Багдановіча ідэя еўрапеізацыі нацыянальнага мастацкага слова, уключэння беларускага пісьменства ў «агульналюдзкі» культурны рух заўжды мела першаступеннае значэнне, цалкам заканамерным падаецца зварот крытыка да пытанняў прафесіяналізацыі як да аднаго са звенняў у праграме «надання» айчыннай літаратуры «больш еўрапейскага выгляду» [2, с. 244]. І хаця М. Багдановіч не ўжывае паняцця «прафесіяналізацыя», інтэнцыя прафесіяналізаваць нацыянальнае слоўнае мастацтва, паскорыць працэс самаўсведамлення беларускай літаратуры, набыцця ёю прыкмет высокапрафесійнасці імпліцытна прысутнічае ў Багдановічавых літаратурна-крытычных матэрыялах. Расчытанне спадчыны М. Багдановіча ў святле праблемы прафесіяналізацыі можа быць прадуктыўным для ўдакладнення наяўных на сёння ацэнак Багдановічавай дзейнасці як крытыка і даследчыка літаратуры. У прыватнасці, такі падыход дазваляе шмат у чым па-новаму зірнуць на ацэнкі, выказаныя М. Багдановічам адносна творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа, вымагае зноў актуалізаваць пытанне пра метадалагічныя прынцыпы М. Багдановіча-крытыка, а значыць пра ролю і месца яго спадчыны ў станаўленні беларускага літаратуразнаўства.

Першае выступленне Максіма Багдановіча ў якасці беларускага крытыка адбылося, як вядома, у 1911 годзе, калі на старонках «Нашай нівы» быў надрукаваны хрэстаматыйны сёння артыкул «Глыбы і слаі: Агляд беларускай краснай пісьменнасці 1910 г.». Аналіз Багдановічавай працы ў кантэксце нашаніўскіх публікацый 1907–1911 гг., датычных

«жывога» літаратурнага працэсу, выяўляе некалькі паказальных акалічнасцей у падыходзе М. Багдановіча да крытычнай дзейнасці.

Па-першае, Багдановічаў агляд меў аб'ём значна большы за ўсе літаратурна-крытычныя матэрыялы (няхай і вельмі нешматлікія), змешчаныя ў «Нашай ніве» да таго часу. Рэдакцыя газеты вымушана была падзяліць публікацыю на некалькі частак, размясціўшы артыкул М. Багдановіча ў трох паслядоўных нумарах. Калі ўлічыць, што пастаянны недахоп месца ў газеце вымушаў усіх аўтараў «Нашай нівы» падладжвацца пад яе фармат і, галоўнае, пад папулярны стыль выкладу (выданне арыентавалася ў першую чаргу на «масавага» народнага чытача), тая акалічнасць, што аўтар «Глыбаў і слаёў» не зрабіў істотнай стылёва-фармавай «падгонкі», а падышоў да справы напісання артыкула прынцыпова, кіруючыся найперш сваімі прафесійнымі перакананнямі даследчыка і крытыка, сведчыць пра пастуліраванне М. Багдановічам ідэі апрычонасці, самадастатковасці працы па «агляданні» беларускага прыгожага пісьменства, рэфлексіі над літаратурным працэсам. Гэта, безумоўна, ужо ёсць пэўны крок насустрач прафесіяналізацыі нацыянальнай літаратуры.

Па-другое, прыход Максіма Багдановіча на літаратурна-крытычную ніву (як некалькімі гадамі раней на паэтычную) не абышоўся, мяркуючы па ўсім, без узнікнення дыскусій у рэдактарскім калектыве «Нашай нівы». Звязана гэта было з інтэлектуальнай спеласцю і арыгінальнасцю Багдановічавых поглядаў. Яны выбіваліся з агульнага рэчышча тагачаснай беларускай літаратурна-мастацкай думкі, моцна зацэнтраванай на прасоўванне ў грамадстве нацыянальна-адраджэнскіх ідэй. Нездарма, друкуючы агляд «Глыбы і слаі», выдаўцы газеты змясцілі разам з ім наступную заўвагу «Ад рэдакцыі»: «Пасьля стацей аб нашых пісьменьніках, друкаваных у №№ 38, 40 і 43 «Нашае нівы» ў тым гаду[1], мы даем мейсцэ працы аб іх нашага пастаяннаго супрацоўніка М. Б., каторы, ўзіраючыся на іх *з боку літаратурнай вартасьці* іх твороў, выказывае неколькі *новых, індывідуальных поглядоў* (вылучана намі. – *Т. В.*) на нашу красную літэратуру» [12]. Ужо сама наяўнасць такога кшталту рэдакцыйнай агаворкі ўскосна сведчыць пра «няўпісванне» (або недастатковае ўпісванне) выказаных М. Багдановічам літаратурных ацэнак у той «вобраз» маладога нацыянальнага пісьменства, які быў створаны публікацыямі нашаніўскіх крытыкаў Уладзіміра Самойлы і Альгерда Бульбы. Вонкавая прычына «неадпаведнасці» М. Багдановіча-крытыка нашаніўскаму літаратурна-крытычнаму кантэксту ляжыць, думаецца, у непадтрыманні Багдановічам агульнага мажорна-ўхвальнага

[1] Маюцца на ўвазе надрукаваныя ў 1910 г. рэцэнзіі Вл. С. (У. Самойлы) на «Адвечную песню» Янкі Купалы; Альгерда Бульбы (В. Чыжа) на зборнікі «Песні жальбы» Якуба Коласа і «Гусляр» Янкі Купалы.

тону[1] апублікаваных да таго рэцэнзій на творы Янкі Купалы і Якуба Коласа.

І для сучасных даследчыкаў літаратурна-крытычнай спадчыны М. Багдановіча жорсткасць некаторых выказванняў пра Янку Купалу ў артыкуле «Глыбы і слаі» застаецца складаным для інтэрпрэтацыі момантам і найчасцей прызнаецца Багдановічавай памылкай: крытык недаацаніў асобныя раннія творы Купалы, не да канца зразумеў адметнасць купалаўскага рамантычнага таленту. Непрыхільнае Багдановічава стаўленне М. Мушынскі вытлумачвае прыналежнасцю аўтара «Глыбаў і слаёў» да культурна-гістарычнай школы, што «не прымала… эстэтычную крытыку, у якой адсутнічаў гістарычны пачатак», і ў адмоўным ключы трактавала «рамантычныя формы мастацтва» як «паэтычную адвольнасць, штучнае канструяванне вобраза рэчаіснасці», а не «рэалістычна-канкрэтны паказ жыцця» [5, с. 170]. «Багдановіч-крытык ацэньваў вершы Я. Купалы з іншых метадалагічных пазіцый, чым іх аўтар», – падкрэслівае даследчык [5, с. 165].

Між тым у «Глыбах і слаях» М. Багдановіч «канцэнтруе ўвагу на эстэтычнай ацэнцы літаратуры» [3, с. 33] і крытыкуе найперш *мастацка-фармавы* бок твораў, які для прадстаўнікоў культурна-гістарычнай школы не быў прыярытэтным пры разглядзе літаратурных з'яў. У «Глыбах і слаях» паэт-крытык дае рэдкую для беларускай літаратурна-крытычнай

---

[1] У сваіх публікацыях У. Самойла і А. Бульба даюць вельмі абагульнены малюнак адроджанай беларускай літаратуры. Для аўтараў рэцэнзій было актуальным найперш завастрэнне ўвагі на самім факце з'яўлення ў беларускага народа «сваіх «пячальнікаў» (У. Самойла), «песні» якіх – «праўдзівы, непадроблены голас, што выходзіць з самай народнай душы» [7], раскрыць значнасць паэзіі Купалы і Коласа для справы беларускага нацыянальнага адраджэння. Менавіта таму абодва рэцэнзенты засяроджваюцца на бясспрэчна станоўчых баках зместу купалаўскіх і коласаўскіх вершаў: гуманістычна-дэмакратычнай напоўненасці, глыбокай народнасці, «праўдзе, веры ў будучыню, бодрасці, глыбокім самапазнанні» [9], «мужыцкай гордасці», «любові да роднай зямлі», «цярпенні за мільёны народ» [10] і інш. Ацэнка формы вершаў, за выключэннем некалькіх вельмі кароткіх станоўчых заўваг («Верш Коласа адзначаецца прастатой, мысль сваю выказывае ён каротка, ясна» [10]; «У кароткім вершы маем колькі абразоў, гарманійна зліваючыхся ў адзін, каторы малюе пуцяводную думку», «У пекнай і індывідуальнай форме напісаны верш Купалы «Замковая гара». Форма яго – кароткая, выразная, добра апрацаваная…» [11]), адсутнічае.

Абагульнена-ўхвальны тон літаратурна-крытычных публікацый У. Самойлы і А. Бульбы можа быць патлумачаны не толькі слабой на той час развітасцю беларускай літаратурнай крытыкі, але найперш аб'ектыўнай неабходнасцю, а таксама асабістым імкненнем рэцэнзентаў замацаваць сацыяльныя і мастацкія пазіцыі маладога нацыянальнага пісьменства ва ўнутрыбеларускай і транснацыянальнай прасторы, стварыць на дадзеным этапе яго развіцця станоўчы кантэкст, спрыяльную глебу для росту. Такія інтэнцыі былі не чужыя і М. Багдановічу-адраджэнцу. У прыватнасці, у адным з лістоў у рэдакцыю «Нашай нівы» ён у напаўжартаўлівай форме адзначае, што цалкам вытрымаў свой уступны артыкул да перакладаў беларускай прозы на рускую мову «ў стылі «гром победы раздавайся» [2, с. 250].



1H 118967

Нацыянальная бібліятэка Беларусі

прасторы перыяду нашаніўства спробу іманентна эстэтычнага мікрааналізу твораў. Купалаўскія вершы перыяду «Жалейкі», паводле М. Багдановіча, «залішне расцягненыя, слаба апрацаваныя з боку формы і мовы» [1, с. 186]. Закіды ў «шурпатасці» датычаць спосабу і сродкаў арганізацыі ўнутранай будовы вершаванага тэксту і аніякім чынам не закранаюць і не прыніжаюць рамантычнага светапогляду Янкі Купалы, не адмаўляюць высокага сацыяльна-гуманістычнага зместу купалаўскай паэзіі. (Дарэчы, М. Багдановіч адразу ж і апраўдвае перад чытачамі паэтава дараванне: «Захоплены абразом прападаючай Беларусі і лічачы, што пясняр перш за ўсё павінен быць грамадзянінам, ён усю ўвагу звяртаў на тое, *што* казаў, не цікавячыся зусім, у якія формы і *як* выліваліся яго думкі» [1, с. 186]). Суровая Багдановічава крытыка скіраваная, такім чынам, супраць недапрацовак тэхнічна-версіфікацыйнага кшталту, формавага «нядбальства» – рэцэдываў слабасці нацыянальнай прафесійнай традыцыі. Для мастака такой магутнасці, «незвычайнасці паэтычнага таленту», як Янка Купала, малая ўвага да тэхнікі верша, да прафесійнай шліфоўкі паэтычнай мовы, лічыць М. Багдановіч, недазваляльная.

На нашу думку, Багдановічавы эстэтычныя ацэнкі «жалейкаўскай» дзейнасці і паасобных вершаў Янкі Купалы, закранутых у «Глыбах і слаях», маюць дастаткова аб'ектыўны, а не суб'ектыўна-заніжаны характар. Сам Купала прызнаваў, што ў пачатковы перыяд «пісаў простыя вершы ў народным стылі» [13, с. 268]. Як сучаснік Купалы, Багдановіч не адчуваў перад ім таго піетэту, які ўласцівы нашаму сённяшняму ўспрыманню, а таму без прыхарошвання адзначыў і станоўчыя бакі, і хібы творчасці будучага класіка. Крытык паказаў разгортванне Купалавага таленту, звярнуў увагу на патэнцыйныя магчымасці паэта, справядліва падкрэсліў, што з-пад «шэрай кары «Жалейкі» пачынае прабівацца вонкі вялікая «краса і моц» [1, с. 187]. Адзначым да таго ж, што годам раней у артыкуле «Беларуская літаратура ў 1909 гаду» С. Палуян (праўда, у менш разгорнутай і таму, магчыма, больш мяккай форме) таксама раіў Янку Купалу пільна «глядзець за сваім паэтычным развіццём», «акуратна абдумваць» і «артыстычна апрацоўваць» [8] вершы: М. Багдановіч, такім чынам, не быў адзіным у крытычным трактаванні некаторых ранніх твораў Купалы. Галоўная ж прычына таго, што М. Багдановіч вытрымлівае строгую манеру выказвання, падрабязна разглядае недахопы купалаўскай паэзіі (як і паэзіі Коласа ў тым самым аглядзе), а станоўчыя моманты толькі канстатуе, звязаная, на наш погляд, з устаноўкай крытыка на дынамізацыю эстэтычных пошукаў і прафесіяналізацыю нацыянальнага слоўнага мастацтва. Дасягнуць больш хуткага прафесійнага сталення беларускай літаратуры было немагчыма без публічнага абгаворвання «балючых» праблем яе развіцця, адна з асноўных сярод якіх – слушна заўважаная М. Багдановічам – слабасць, недасканаласць мастацка-формавай апрацоўкі вершаванай мовы.

У артыкуле «За тры гады» (1913), які, побач з «Глыбамі і слаямі», «найбольш поўна выяўляе аблічча М. Багдановіча як беларускага крытыка» [6, с. 462], аўтар падтрымлівае ўзяты ім кірунак на канструктыўную крытычнасць як сродак павелічэння інтэнсіўнасці працэсаў эстэтычнага самаўсведамлення нацыянальнай літаратуры. Хаця тон агляду «За тры гады» ўжо відавочна больш стрыманы, пазітыўны (што выклікана аб'ектыўным узмацненнем мастацкіх пазіцый, агульным ростам «вартасці твораў» [1, с. 223] беларускага пісьменства да 1913 г.), М. Багдановіч па-ранейшаму імкнецца падкрэсліць у сваіх ацэнках такія ўласна прафесійныя моманты літаратурна-мастацкай дзейнасці, як «прыгожая будова верша», «ражнастайнасць рытмаў», «рупная шліфоўка», «пекнае счэпліванне рыфм», «сіла і сціснутасць мовы» [1, с. 223, 225]. Больш увагі ў аглядзе нададзена пытанням індывідуалізаванасці, арыгінальнасці стылю і мовы пісьменніка (як, напрыклад, у ацэнцы творчасці Алеся Гаруна), з'яўленню «новых тэмаў і новых спосабаў абработкі тэм» [1, с. 228], што таксама, паводле М. Багдановіча, ёсць заклад прафесійнай сталасці літаратуры, яе руху наперад.

Такім чынам, Максім Багдановіч як тэарэтык і ідэолаг развіцця нацыянальнай літаратуры чуйна ўлавіў патрэбы маладога пісьменства і публічна агучыў, асэнсаваў неабходнасць пазбаўлення ад рэцыдываў «непрафесійнасці» мастацкага мыслення. Выказаныя і развітыя Багдановічам ідэі прафесіяналізацыі, роўна як і яго практычныя намаганні ў галіне дыверсіфікацыі, узбагачэння беларускай мастацкай прасторы, аказалі істотны ўплыў на складванне нацыянальнага класічнага стылю і паскарэнне выхаду беларускай літаратуры на новыя, сусветныя гарызонты.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. *Багдановіч, М.* Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1993. – Т. 2: Мастацкая проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. – 600 с.

2. *Багдановіч, М.* Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1995. – Т. 3: Публіцыстыка, лісты, летапіс жыцця і творчасці. – 461 с.

3. *Конан, У.* Развіццё эстэтычнай думкі ў Беларусі (1917–1934 гг.) / У. Конан. – Мінск, 1968. – 189 с.

4. *Колас, Я.* Сымон Музыка: паэма / Я. Колас. – Мюнхен, 1955. – 216 с.

5. *Мушынскі, М.* Каардынаты пошуку: беларуская крытыка: набыткі і перспектывы / М. Мушынскі. – Мінск, 1988. – 256 с.

6. *Мушынскі, М.* Навуковая і літаратурна-крытычная спадчына М. Багдановіча / М. Мушынскі // Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1993. – Т. 2: Мастацкая проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. – С. 446–480.

7. Наша ніва. – 1909. – № 17.

8. Наша ніва. – 1910. – № 7.

9. Наша ніва. – 1910. – № 38